Праф.Слука А. Г.,
Беларускі дзяржаўны універсітэт

Філасофія рэчаіснасці ў беларускай камунікацыі.
( "Звязда", "Советская Белоруссия").

Заканамернасці грамадскага развіцця мінулага XX стагоддзя былі заснаваны на фарміраванні новых рэалій у жыцці асобнага грамадзяніна і ўсяго чалавецтва. Адбыліся тэканічныя зрушэнні ў філасофіі ўсталявання сусвету: на змену традыцыйнаму саслоўна-іерархічнаму прадстаўленню аб уладкаванні чалавека ў прыродзе і грамадстве прыходзіла рэвалюцыйная метадалогія асваення і падчынення космасу, асэнсавання адносін людзей да веры ў Бога і дэмакратычнай арганізацыі сацыяльнай рэчаіснасці.

У аб'ектыўным працэсе палітычнай рэфармацыі праявіўся крызіс буржуазнай маралі і філасофіі, якія супярэчылі новым ідэалагічным прынцыпам развіцця свабоды, дэмакратыі і сацыяльнай справядлівасці і стала глабальна распаўсюджвацца сацыялістычная канцэпцыя светаўладкавання, як магчымы, новы і эфектыўны шлях прагрэсіўнага развіцця грамадства і спасціжэння вышэйшай ісціны чалавекам. (Вебер М. Пратэстанская этыка і дух капіталізма.). Ідэалогія сацыялізма значна пацясніла філасофію лібералізму і стала не толькі прывабным, але і аўтарытэтным сусветным вучэннем.

Прапаганда новай ідэалогіі і кансерватыўнае апаніраванне з боку традыцыйнай буржуазнай навукі запатрабавала стварэння глабальнага амвона для абвяшчэння сацыялістычных ідэй у грамадстве. Выйсці на перманентны дыялог з "усім чалавецтвам" дапамагла масавая камунікацыя, узрыўное развіццё перыядычнага друку, а затым радыё і тэлебачання. Гэта была трэцяя сусветная "цывілізацыйная рэвалюцыя" (Ясперс К. Сэнс і прызначэнне гісторыі.).

У адказны для чалавецтва час змены эпох у розных краінах з'явіліся нацыянальныя перыядычныя выданні, цэлыя атрады сацыяльна і палітычна арыентаванай прэсы, моцная індустрыя друку для фарміравання рэвалюцыйнай грамадскай думкі.(Ленін В.І. Задачы партыйнага друку). Грамадства чакала ад інтэлектуалаў канкрэтнай і зразумелай анталагічнай арыентацыі ў новых гістарычных умовах і хацела бачыць рэчаіснасць пазнавальнай і для сябе прываблівай. Як рэзультат грамадскага пошуку ў розных краінах узніклі нацыянальныя сістэмы друку і з'явіліся грамадскія выданні, якія ператварыліся ў своеасаюбівыя энцыклапедыі развіцця нацый і створаных на пераломе эпох новых дзяржаў.

У Беларусі таксама ўзнікла спецыфічная нацыянальная сістэма прэсы, як новы грамадскі інстытут і своеасаблівы палітычны феномен, якая стала прапагандыстам ідэалогіі практычнага сацыялізму. Першымі і асноўнымі выданнямі беларускай рэвалюцыйнай эпохі сталі газеты "Звязда" і "Савецкая Беларусь" (№ 1 выйшаў 1 лютага 1920 г. у Смаленску. Слука А.Г. Беларуская журналістыка. Ч.1).

Названыя газеты былі вынікам аб'ектыўных рэвалюцыйных абставін і дзеянняў уплывовай палітычнай сілы, бальшавіцкай партыі, якая прапанавала грамадству сваю ўнікальную праграму сацыяльна-эканамічнага будаўніцтва сацыялістычнай краіны. Бальшавіцкая прэса стала прапагандыстам самых пажаданых насельнтцтвам праграм: Канец вйне!, Заводы рабочым!, Зямлю сялянам!

Даследчыкі іншы раз характарызуюць дзейнасць савецкага друку пазбаўленага свабоды слова. Гэта сучасная ацэнка і яна небезпадстаўная з боку крытыкі гістарычнага вопыту сацыялізму. Аднак патрэбна зыходзіць з аб'ектыўнага факта, што функцыянаванне партыйнага друку высноўвалася на камуністычных прынцыпах і савецкія журналісты выконвалі законы партыйнай праграмы і Статута партыі. Інакш і быць не магло пры існаванні аднапартыйнай сістэмы.

Беларускі партыйны друк свядома падтрымліваў дзяржаўную палітыку будаўніцтва сацыялізму і ў агульным імкненні да гэтай мэты выконваў грандыёзныя задачы. "Звязда", "Советская Белоруссия", уся беларуская прэса фарміравалі грамадскую думку новай палітычнай эпохі. Камунікацыйныя каналы і ў першую чаргу партыйны друк сталі ідэалагічным прапагандыстам і заснавальнікам СССР і, што не менш важна, нацыянальных савецкіх рэспублік, нашай БССР, адносна свабодных дзяржаўных утварэнняў, якія цяпер з'яўляюцца незалежнымі краінамі на прасторы СНД.

Беларускі друк не толькі дэкляраваў партыйныя лозунгі, але і прапанаваў грамадству канкрэтныя праграмы жыццядзейнасці ва ўмовах станаўлення савецкай ўлады, якія сталі вырашальнымі пры сацыялістычным выбары развіцця, рэалізацыі палітычных, эканамічных і культурных праблем савецкай дзяржавы і нацыянальных рэспублік.

Палітычныя сентэцыі ў адрас камуністаў, што іх палітыка не прадугледжвала стварэння самастойнай Беларускай Рэспублікі, гэта больш эмацыянальнае заключэнне крытыкаў "бальшавіцкага рэжыму". Савецкі ўрад будаваў новую краіну на геапалітычных прасторах былой Расійскай імперыі і па аб'ектыўным ваенна-палітычным, эканамічным і асобным суб'ектыўным прычынам не ўзнікала праблемы тэрытарыяльнага яе дзялення, хаця ў ленінскай праграме быў пункт рашэння нацыянальнага пытання "вплоть до самоопределения".

Падкрэслім асабліва важнае: перыядычны друк і асабліва газета "Звязда" спрыялі канчатковаму афармленню маладой беларускай нацыі ў канцы 20-х г. і ўз'яднанню беларускага народа ў адзінай рэспубліцы ў канцы 30-х г. Гэта характарызуецца тым, што ў даваенны перыяд у БССР была сфарміравана спецыфічная палітычная культура і эфектыўная сацыялістычная эканоміка. Беларуская прэса ў той час стала інтэлектуальным здабыткам беларускай нацыянальнай культуры і моцным фактарам фарміравання грамадскай думкі.

Канцэпцыя сацыялістычнай мадэлі атрымала спецыфічнае развіццё у беларускай прэсе ў гады Другой сусветнай вайны. Рэпрэсіўнаму нашэсцю фашысцкіх войскаў было супрацьпастаўлена разам з ваеннай арганізацыяй маральна-палітычнае аб'яднанне савецкіх людзей у барацьбе за свабоду Радзімы.

Беларускае грамадства ў час вайны па многіх прычынах было моцна раздробленым маральна-палітычна і арганізацыйна аслабленым. Здавалася, што на акупіраванай тэрыторыі, ваенна-палітычны парытэт павінен быў заставацца за фашысцкімі захопнікамі, на што яны моцна разлічвалі. Тым больш, што разам з рэпрэсіўным "новым парадкам" на беларускае насельніцтва значны ўплыў аказвала фашысцкая і калабарацыяністкая прапаганда, якая гвалтоўны захоп тэрыторыі суверэннай краіны выдавала як "збаўленне ад камуністычнай сістэмы".

Аднак і ідэалагічную вайну фашысты прайгралі. Яны парушылі закон герменеўтыкі знаёмы еўрапейскаму грамадству яшчэ па Гегелю: "узнясенне над сваёй сутнасцю", аднак змест гэтай сутнасці ў акупантаў быў фактычна звярыным. Фашысты на беларускай тэрыторыі расстрэламі, забойствамі, катаваннямі, рабаўніцтвам, гвалтаваннем растапталі асноўныя гуманістычныя прынцыпы існавання чалавецтва. Пад прыкрыццём "новага парадку" было памкненне адняць свабоду народа і дзяржавы, тыя каштоўнасці, да якіх беларускі народ ішоў больш тысячагоддзя.

Савецкія сродкі камунікацыі ў час вайны абстрагіраваліся ад мінулых унутраных палітычных і эканамічных праблем і сацыяльных канфліктаў. Асноўным сэнсакіраваннем асобы было змаганне супраць рабства і пагрозы заўчаснай і ганебнай смерці ад рук заваёўнікаў. Такая маральная ўстаноўка адстайвання сваёй чалавечай годнасці, актыўнага адмаўлення фашысцкага разбою

была зместам беларускай філасофскай публіцыстыкі Я.Купалы, Я.Коласа, К.Чорнага, К.Крапівы, А.Куляшова і інш. і супадала з сутнасцю савецкага грамадства якое пратэставала супраць гвалтоўнага насілля.

Газета “Звязда” была зоркай вызвалення ад фашысцкага рабства, маральна-палітычнай апорай грамадства і арыентавала людзей як у жахлівым смяртэльным становішчы захаваць жыццё і нацыянальныя сілы для будучага росквіту Радзімы. Сфакусіраваная грамадская каштоўнасць дзейнасці “Звязды” выражана таксама ва ўзнагародзе яе ваеннага рэдактара Уладзіміра Амельянюка званнем Героя Савецкага Саюза. “Савецкая Беларусь” у час вайны набыла мадыфікацыйную мадэль перыядычнага выдання і друкавалася ў Расіі трыма выпускамі і распаўсюджвалася ў прыфрантавой паласе і на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі. супраць акупантаў У свабодалюбівым друкаваным беларускім слове быў выражаны справядлівы меч народнага гневу.

Вядома, што ідэалогія пасляваеннага развіцця сацыялізму была моцна абцяжарана палітычным валюнтарызмам не толькі з боку камуністычнай стратэгіі і тактыкі, але і “халоднай вайной”. Аднак беларускія сродкі інфармацыі ў меншай меры былі падвержаны “шкоднаму ўплыву Захаду” і асоўную ўвагу надавалі развіццю народна-гаспадарчага комплексу, культурнаму і матэрыяльнаму забяспячэнню насельніцтва.

“Звязда” і “Советская Белоруссия” як галоўныя газеты БССР стваралі пазітыўную карціну складанай савецкай рэчаіснасці. Так як у сферы партыйнай свабоды слова па-ранейшаму дзейнічала цвёрдае цэнзурнае права і ў палітыка-эканамічным становішчы існавала дырэктыўная залежнасць, то партыйна-савецкі друк асноўную ўвагу ўдзяляў маральна-этычным праблемам чалавека і грамадства. Праблемы творчай дзейнасці, “працоўнага гераізму” былі не толькі зместам сродкаў інфармацыі, але і своеасаблівым маральным культам усяго савецкага грмадства.

У 60-я г. ў беларускай журналістыцы сфарміравалася маральна-парблематычная ўплывовая публіцыстыка, якая ў першую чаргу канцэнтравалася ў вядучых рэспубліканскіх выданнях, на радыё і тэлебачанні. Гэта цікавая культуралагічная тэндэнцыя праявілася ў працэсе кансалідацыі ўсяго беларускага грамадства і ў шэрагу партыйна-палітычных, дзяржаўна-арганізацыйных і маральна-этычных фактараў аказала вырашальны ўплыў на агульны працэс імклівага эканамічнага і культуранга развіцця рэспублікі: 60-я–70-я гг.– гэта найбольш эфектыўны перыяд развіцця СМІ Беларусі і аб’ектыўнага супадзення рэчаіснасці са зместам сродкаў інфармацыі, запросамі масавай аудыторыі і прафесійнымі інтарэсамі журналістаў. Сістэмны аналіз сучаснасці і перспектыўны погляд у будучыню сфармуляваны ў публіцыстыцы А.Адамовіча, В.Быкава, У.Караткевіча, А.Макаёнка і інш. Ідэі публіцыстычнай творчасці выдатных творцаў фактычна сталі асновай дэмакратызацыі беларускай рэчаіснасці.

Працэс сацыяльна-эканамічнага развіцця савецкай краіны быў падарваны суб’ектыўна-валюнтарысцкай партыйнай палітыкай, якая прывяла да роспуску СССР і агульнага краху сацыялістычнай сістэмы. Свой негатыўны ўплыў на ўсеагульны крызіс сацыялізму ўнеслі і СМІ. У 80-я гады аб’ектыўная рэальнасць у СМІ была падменена міфатворчсцю і маніпулятыўнасцю. Працэс скажэння інфармацыі дасягнуў такога становішча, што ірэальныя прадстаўленні партыйнай наменклатуры трансліраваліся журналістамі як аб’ектыўная ісціна.

Адбылося штучнае аддзяленне грамадскай інфармацыі ад аб’ектыўных поглядаў насельніцтва аб крызісным становішчы і бяссілля партыйнай і савецкай улады пазітыўна ўплываць на супярэчлівыя сацыяльныя працэсы. Законы партыйнага кіраўніцтва грамадскай думкай і СМІ увайшлі ў супярэчнасць з рэчаіснасцю і дыскрэдытавалі ўсю сістэму старой кмунікацыі. Савецкія СМІ не змаглі прааналізаваць прычыны стагнацыі палітыка-эканамічнай сістэмы і не папярэдзілі грамадства аб набліжаючайся сацыяльнай катастрофе.

У той жа час у плыні адыходзячай партыйна-савецкай інфармацыі пазначылася новая дэмакратычная тэндэнцыя камунікацыйнай сувязі з грамадствам. Пасля стварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь у 1991 г. пачаўся сучасны перыяд дзеяння СМІ на аснове законаў дэмакратычнага грамадства. Да гонару “Звязды” і “Советской Белоруссии” рэдакцыі захавалі свой дзяржаўны статус, масавую аудыторыю, народныя традыцыі і яркі публіцыстычны змест, які быў напоўнены ідэалогіяй свабоднага будаўніцтва суверэннай краіны Рэспублікі Беларусь.

Канцэптуальнай праграмай камунікацыі ў новым часе стала філасофская парадыгма ХХ1 стагоддзя: захаванне прыроды ў сучасным стане для будучых пакаленняў; вырашэнне дэмагарафічных праблем беларускай нацыі; стварэнне ўстойлівай сістэмы нацыянальнай бяспекі па ўсім спектры вызываў часу ад вырашэння праблемы забяспячэння прадуктамі і ліквідацыі пагрозы глабальных хвароб; фарміравання новай культурнай прасторы для рэалізацыі інавацыйнай праграмы “грамадства ведаў”.

На фоне глабальных задач нацыянальныя СМІ, якія сталі цяпер паўнапраўнай падсістэмай сусветнай інфармацыйнай прасторы, аналізуюць стратэгічныя праблемы беларускага гарамадства: абмеркаванне механізмаў арганізацыі і функцыянавання дзяржаўнай улады, палітычнага працэсу, заканамернасцей развіцця сацыяльна-рэгулюемай эканомікі, нацыянальнай культуры, што інтэгруецца ў распарцоўцы сучаснай ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці –“беларускага шляху” у ХХ1 стагоддзе.

Рэспубліканскія СМІ, і найперш нацыянальная “Звязда” і прэзідэнцкая “Советская Белоруссия”, распрацоўваюць новыя традыцыі адлюстравання сучаснасці на аснове інавацыйнай праграмы стварэння эфектыўнай дзяржавы ўстойлівага развіцця. Гэта праграма вельмі складаная і працяглая ў часе, аднак яе перспектыўныя вынікі яскрава паказваюць, што гэты шлях беларускаму народу неабходна прайсці.

Сутнасць беларускага шляху публіцысты бачаць у рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь – стварэнні інтэлектуальнага навуковага прадукта–інавацыйнай універсітэцкай адукацыі; арганізацыі вытворчасці на шостым ўзроўні тэхналагічнага забяспячэння; вырашэння задач сацыяльнай абароны насельніцтва на сучасным узроўні сусветнай культуры. Такім чынам сучасныя СМІ будуюць свабодную і незалежную Беларусь ХХ1 стагоддзя, суверэнную краіну ў сусветным супольстве.

Вывады можна зрабіць наступныя: дзве нацыянальныя газеты “Звязда” і “Советская Белоруссия” з’яўляюцца аб’ектыўным летапісам беларускай рэчаіснасці ХХ стагоддзя. У змесце гэтых выданняў адлюстравана супярэчлівая, трагічная і гераічная біяграфія беларускага народа, яго складаны шлях да свабоды і незалежнасці, а таксама стваральнасць, творчасць, гуманізм, што з’яўдяецца асноўным філасофскім сэнсам яго існавання.

Газеты сталі адным з асноўных і моцных фактараў фарміравання беларускай мовы і нацыі, ідэалогіі будаўніцтва самастойнай дзяржавы, развіцця нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа. Галоўныя беларусія газеты з’яўляюцца маральна-этычным інтэлектуальным асяродкам фарміравання новай культурнай прасторы, “грамадства ведаў”, заснаванага на інавацыйнай дзейнасці сучаснага цывілізаванага грамадства.

Творчы вопыт многіх пакаленняў журналістаў з’яўляецца асновай таленавітай школы беларускай літаратуры і публіцыстыкі і паўплываў на развіццё працэсу падрыхтоўкі кадраў для СМІ у Рэспубліцы Беларусь. Падкрэслім таксама, што і “Звязда” і “Советская Белоруссия” з’яўляюцца найбольш устойлівымі перад выклікамі часу і мала ў свеце грамадска-палітычных перыядычных выданняў, якія перажылі супярэчлівае і трагічнае ХХ стагоддзе. А перад таленавітымі рэдакцымі беларускіх газет ХХ век супакоіўся, заціх, скарыўся гістарычнымі запісамі на іх старонках.

Якія змены адбудуцца ў беларускіх СМІ у бліжэйшы час? Аналіз паказвае, што “Звязда” і “Советская Белоруссия” і ў новым стагоддзі захаваюць свой статус асноўных нацыянальных выданняў. Іх далейшае развіццё можа быць адзначана тым, што ў бліжэйшы час ў Беларусі будуць створаны два холдынгі з змешаным дзяржаўна-прыватным капіталам пад патранатам дзвюх асноўных нацыянальных газет.

Першы холдынг “Звязда” аб’яднае большасць рэспубліканскіх беларускамоўных выданняў у тым ліку і традыцыйныя часопісы. Другі холдынг – “Беларусь сегодня” – ужо фактычна функцыяніруе, калі ўлічыць выпускаемыя “Советской Белоруссией” дадаткі. Пры юрыдычным афармленні холдынгаў да іх будуць далучаны некаторыя іншыя выданні (“Знамя юности”) і будуць пераразмеркаваны дзяржаўныя датацыі.

Працэс развіцця інфармацыйнай прасторы паказвае таксама, што паступова закончацца супярэчнасці паміж афіцыйнымі і неафіцыйнымі каналамі камунікацыі. Зближэнне пазіцый адбываецца на агульнай метадалагічнай аснове дзейнасці дэмакратычных СМІ і не азначае ідэалагічнай ідэнтычнасці зместу. Канчатковая праграма “дзяржаўнай і апазіцыйнай” прэсы, іх “целеполагание” супадае ў канечным выніку – пабудова свабоднай і незалежнай краіны, дасягненне высокага матэрыяльнага і духоўнага развіцця беларускага народа, што з’яўляецца асноўнай сутнасцю ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці на сучасным этапе.

Непазбежна афіцыйныя СМІ будуць эвалюцыяніраваць у сваім змесце да больш крытычнага аналізу і грамадскаму кантролю дзяржаўных органаў, што спрыяе эфектыўнай іх дзейнасці, а неафіцыйныя – ужо цяпер паступова набліжаюцца да канструктыўнага і аб’ектыўнага адлюстравання рэчаіснасці. Такім чынам афіцыйныя і неафіцыйныя СМІ – гэта два бакі аднаго працэсу будаўніцтва краіны. Такая аб’ектыўная матрыца камунікацыі - міжнародная практыка дзейнасці сучасных СМІ і адзіны шлях набліжэння да ісціны. Ён становіцца характэрным і для Беларусі.